**Пакуль мы помнім - мы жывем!**

Жудаснае слова “вайна” і шчаслівае слова “Дзень Перамогі”…

Мы шмат ведаем пра вайну: мільёны загінулых, зламаных і скалечаных лёсаў людзей, тысячы разбураных гарадоў і вёсак…

Вайна пакінула крывавы след у гісторыі нашага народа, кожнай сям’і.

Збіраючы разам з настаўніцай Кароткай К. А. інфармацыю аб рэдактарах раённай газеты, мы даведаліся, што два нашых землякі, былі яе галоўнымі рэдактарамі. Адзін – да вайны, другі – пасля вайны. І не толькі…

Складанае жыццё дасталося гэтым людзям – гады ваеннага ліхалецця.

Якаў Трыфанавіч Аўчароў з першых дзён вайны пайшоў на фронт. Батальённы палітрук, ён быў у самым полымі вайны, трымаў абарону пад Масквой. Нават не ведаў, дзе знаходзілася яго сям’я, якая была эвакуіравана ў Марыйскую АССР разам з абсталяваннем папяровай фабрыкі.


ЛЕНІНЕЦ

«Дзень добры, дачушка!»

В. АЛЯКСЕЕВА.

Мы знайшлі невялікі артыкул пра Якава Трыфанавіча, дзе змешчана вестачка – паштоўка яго дачцэ – Людміле і піянерам яе атрада:

“…Агульнымі сіламі вы ў сябе ў тыле, мы тут на фронце будзем граміць фашыстаў… Мы ўвесь час прасоўваемся ўперад, вызваляючы населеныя пункты. Ты, напэўна, чытаеш газеты, значыць бачыш, як коцяцца ад Масквы фашысты”.

Падчас бітвы на Валакаламскім напрамку трапіў у шпіталь. Потым, будучы інвалідам Айчыннай вайны, ён узначальваў калгас “Сялянскі ўздым”, Волжскі раён (Марыйская АССР)

Не дажыў салдат да Перамогі, памёр у 1942 годзе. Але памяць аб гэтым мужным чалавеку, які свята верыў у перамогу і аддана любіў сваю Радзіму, будзе жыць.



Сямён Паўлавіч Канцавы таксама наш зямляк, нарадзіўся ў Крупцы. У 17 гадоў дабраахвотнікам пайшоў на фронт. Шлях да перамогі пачаў з вызвалення Масквы.

У час наступлення ў 1941 годзе за Маскву малодшы лейтэнант быў цяжка паранены ў локцевы сустаў. Пасля лячэння ён служыў на ваенным складзе НКА 214. Двойчы лічыўся прапаўшым без вестак. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём “За перамогу над Германіяй”.



Пасля вайны аддана працаваў на розных кіруючых пасадах.

Цікавымі звесткамі з жыцця Сямёна Паўлавіча у форме артыкула “Наш герой” падзялілася сям’я яго ўнука.





Яны не сталі Героямі Савецкага Саюза, не здзейснілі ніякіх гучных подзвігаў. Такіх салдат на вайне было сотні тысяч. Але як і ўсе, яны набліжалі Перамогу, метр за метрам, крок за крокам.

**Ведаем! Помнім! Ганарымся!**

Кароткая К. А., настаўнік беларускай мовы